©Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа

***Дулуб А. Я.**, настаўнік пачатковых класаў Вялікаэйсмантаўскай сярэдняй школы Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці*

# Чароўны квадрат
## Інтэрактыўная гульня

***Мэта:*** арганізаваць дзейнасць вучняў па фарміраванню цікавасці для вывучэння роднай мовы.

***Задачы:***

•садзейнічаць узбагачэнню слоўніка вучняў лексікай беларускай мовы, развіццю лагічнага мыслення, кемлівасці і ўвагі;

•садзейнічаць выхаванню пачуцця гонару за сваю мову, выхаванню самастойнасці ў рабоце, дысцыплінаванасці.

***Абсталяванне:*** мульціборд, карткі з заданнямі.

1. **<u>Арганізацыйны этап.</u>**

— Добры дзень, дзеці! Рада бачыць усіх вас.

— Падарыце сваю ўсмешку. Жадаю вам плённай працы!

2. **<u>Мэтавызначэнне.</u>**

— Вызначыць тэму заняткаў нам дапаможа воблака слоў. Хто здагадаўся, пра што пойдзе гаворка?



— Так. Сёння да вас на занятак павінна была прыйсці Беларуская мова, але яе схапілі злыя людзі. Яны кажуць, што нам, беларусам, не патрэбна мова і мы яе не ведаем. І зараз лёс нашай мовы залежыць ад вас, мае сябры. Дапаможам мове?

— На дошцы вы бачыце звычайны, на першы погляд, квадрат, але гэта не так. Наш квадрат — чароўны, ён складаецца з дзевяці маленькіх квадрацікаў, у якіх змешчаны розныя заданні. Вы павінны выканаць іх і даказаць людзям, што мы, беларусы, любім і ведаем мову. Вы згодны са мной? Тады пачнём.

**3. <u>Асноўны этап.</u>**

**1-шы квадрацік.**

***Гульня «Назаві адным словам»:*** тром відавым паняццям неабходна падабраць абагульняючае радавое.

Пчала, жук, чмель — (насякомыя).

Верабей, ластаўка, сарока — (птушкі).

Заяц, воўк, ліса — (звяры).

Званочак, рамонак, васілёк — (кветкі).

Сукенка, хустка, шапка — (адзенне).

— Добра, вельмі добра!

**2-гі квадрацік.**

***Гульня «Знайдзі пару».***




https://learningapps.org/watch?v=p0acvkqc522

**3-ці квадрацік.**

***Гульня «Домік».***

— «Сарвіце» галосныя з дрэва і ўстаўце ў акенцы доміка.

— Якія словы атрымаліся?

На дошцы вісіць нагляднасць.



| | | |
|---|---|---|
| с | | н |
| с | | р |
| с | | д |
| с | | к |
| с | | д |




***Фізкульхвілінка.***

***Гульня «Жывы — не жывы».***

— Вы, напэўна, стаміліся. Давайце адпачнем.

Настаўнік называе слова. Калі яно абазначае жывую істоту, дзеці імітуюць яе рухі, калі нежывую — спакойна стаяць. Вучань, які памыліўся, прысядае каля парты.

Казуля — кашуля.

Лыжка — мышка.

Дошка — кошка.

Крот — рот.

Жабка — шапка.

Ножык — вожык.

Рак — мак.

Качка — тачка.

**4-ты квадрацік.**

***Гульня «Наадварот».***

Настаўнік гаворыць слова і кідае мяч вучню, а вучань называе слова з супрацьлеглым значэннем.

Дзень — (ноч)

Ранак — (вечар)

Зіма — (лета)

Чысты — (брудны)

Мяккі — (цвёрды)

Ідзе — (стаіць)

Купіў — (прадаў)

Часта — (рэдка)

Высока — (нізка)

Сумна — (весела)

Згубіў — (знайшоў)

Цяжка — (лёгка)

Шырокі — (вузкі)

Цёмна — (светла)

Глыбока — (мелка)

Справа — (злева)

**5-ты квадрацік.**

***Красворд «Школьны дыктант».***

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **д** | з | ё | н | н | і | к |
| | с | ш | **ы** | т | а | к | | | |
| | б | у | **к** | в | а | р | | | |
| п | а | р | **т** | а | | | | | |
| | | р | **а** | н | е | ц | | | |
| з | в | а | **н** | о | к | | | | |
| н | а | с | **т** | а | ў | н | і | к | |

1. Люстэрка вучня.
2. Прыналежнасць для пісьма.
3. Самы першы падручнік.
4. Мэбля ў класе.
5. Школьная сумка.
6. Доўгачаканая мелодыя, якая сведчыць аб заканчэнні ўрока.
7. Чалавек, які дае веды.

**6-ты квадрацік.**

***Гульня «Літара заблудзілася».***

**1.** «Малако дае карова», — напісаў на кошцы Вова. *(Дошцы.)*

2. Ліза мазі папрасіла: Лізу вуха ўкусіла. *(Муха.)*

**3.** Закрычаў Егорка: «З неба ўпала горка!» *(Зорка.)*

**4.** Горка плача Лена: «Ой, баліць палена!» *(Калена.)*

**5.** Назбіралася народу. Дзіва, поўны вулей лёду. *(Мёду.)*

**7-мы квадрацік.**

***Рэбусы*** (праца ў парах).




1 — вожык, 2 — ветразь, 3 — волат, 4 — вольха, 5 — выдры, 6 — воля, 7 — вакса, 8 — водар.

— Што агульнае ў гэтых слоў? *(Пачынаюцца з літары **в**, назоўнікі.)*

**8-мы квадрацік.**

***Гульня «Словы-хітруны».***

— Знайсці, якія словы «схаваліся» ў словах.

***Словы-хітруны***

| | |
|---|---|
| карагод | парасон |
| пенал | салата |

| | |
|---|---|
| смак | пірог |
| дрот | пясок |
| цікава | клубок |
| парася | малако |
| карысна | кароўка |

**9-ты квадрацік.**

***«Прадоўжы прыказку»*** (групавая работа).

— Свае назіранні за жыццём, свае мудрыя парады народ выказаў у прыказках. Яны кароценькія, але вельмі мудрыя.

Камандам раздаюцца карткі, на якіх запісаны пачатак прыказак. Задача: прадоўжыць прыказку.

Чалавек без працы, … (*што птушка без крылаў*).

Грэе не шуба, … (*а праца*).

Добра працуем — … (*павагу маем*).

Бацькоў слухаць — … (*гора не ведаць*).

Слязьмі гору … (*не паможаш*).

Якая справа — … (*такая і слава*).

Найсмачнейшы хлеб … (*ад сваёй працы*).

Хто працуе, … (*той не сумуе*).

Дыму без агню … (*не бывае*).

Адклад не ідзе … (*на лад*).

— Малайцы! Вы адказалі на ўсе пытанні і выканалі ўсе заданні. Наша мова зноў з намі.

— Але паглядзіце на квадрат. Што гэта атрымалася? *(Кросэнс.)* Паспрабуем яго разгадаць.

<table>
<tr><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>?</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>

— Што атрымалася? *(Беларуская мова.)*

| | |
|---|---|
|  | першая наша кніга, па якой мы вучыліся чытаць, надрукавана на беларускай мове |
|  | беларуская мова — дзяржаўная мова |
|  | першыя словы нашай мовы мы чуем ад маці |
|  | мова перадаецца з пакалення ў пакаленне |
|  | беларуская мова пявучая, мілагучная |
|  | Янка Купала і Якуб Колас — вядомыя беларускія пісьменнікі |
|  | Францыск Скарына — беларускі першадрукар, які першы надрукаваў кнігу на старабеларускай мове |

| | |
|---|---|
|  | гэта адметная асаблівасць нашага народа |

4. **Рэфлексія.**

— У кожнага з вас на стале валошкі. Давайце сплящем падарунак Беларускай мове — вяночак. Той, каму было цікава на занятку, хто даведаўся нешта новае, прымацуйце валошкі на вянок.





Дзеці прымацоўваюць кветкі на вянок да дошкі.

5. **Вынік заняткаў.**

— Вы малайцы. Працавалі на выдатна, вельмі стараліся. І так прыемна было чуць на занятку нашу родную мову.

— Беражыце сваю родную мову, шануйце яе, таму што, як сказаў беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч: «Хто забыў сваіх продкаў —сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў».

— Дзякую за ўвагу.